# Узаемная матывацыя

**Кожнаму з нас школа дапамагла вызначыць свой далейшы шлях. Вось і на выбар прафесіі Ульяны Мілашэўскай паўплывалі яе педагогі. З гэтага навучальнага года маладая настаўніца пачала выкладаць гісторыю ў сталічнай школе № 205 імя Р.У.Дольнікава.**



### Паверыць у шчырасць

**— Як вы лічыце, што галоўнае ў адносінах з дзецьмі?**

— Трэба шчыра ставіцца да сваіх выхаванцаў. Дзеці выдатна адчуваюць атмасферу ўрока, настрой настаўніка. І калі ты прыходзіш да іх з адкрытай душой, з пазітывам і жаданнем несці дабро, то атрымліваеш тое ж у адказ. У пачатку заняткаў заўсёды пытаюся ў дзяцей пра іх справы, як праходзіць іх дзень. Яны могуць выказацца адным словам "класна", "крута" альбо расказаць, чаму дзень не задаўся. Гэта дапамагае ім раскрыцца, праявіць сваю асобу і настроіцца на вучэбны лад. Так, з першых хвілін урока ў нас устанаўліваюцца даверлівыя адносіны.

**— А як удалося заслужыць паважлівае стаўленне да сябе як педагога?**

— Я доўга думала, як мне дастойна сябе паставіць перад класам, каб дзеці мяне слухаліся. Знешне я падобная на школьніцу, таму старшакласнікі могуць успрыняць мяне як равесніцу. Але паміж настаўнікам і дзецьмі павінна існаваць тая нябачная мяжа, якая робіць статус педагога бясспрэчным. Лічу, што гэта абавязковае правіла. Таму, прыйшоўшы ў клас, я дакладна абазначыла межы паміж сабой і вучнямі, правілы паводзін, якія павінны выконвацца на ўроку: уважліва слухаць, выконваць усе заданні, сачыць за ходам заняткаў і не адцягваць увагу аднакласнікаў не па тэме ўрока. Не усе гэтыя пастулаты адразу дасягнуць выніку на ўсе сто не ўдасца, патрэбен час. Дзеці розныя: яркія, харызматычныя, не заўсёды паслухмяныя. З аднымі ўдаецца адразу ўстанавіць кантакт і ўзаемаразуменне, з іншымі — праз больш працяглы час. Але дзелавыя і сяброўскія адносіны з выхаванцамі ўмацоўваюцца з кожным днём.

**— Чым дапамагаюць калегі?**

— З першых дзён маёй работы кіраўніцтва, педагогі імкнуцца аказаць падтрымку, дапамагчы парадай.

> У нас вельмі згуртаваны калектыў, кожны ў ім — непаўторная, творчая асоба, а ўсе разам мы адзінае цэлае, аб'яднанае адной мэтай — вучыць і выхоўваць дзяцей.

Гэта матывуе не адставаць. Калегі дапамагаюць з дакументацыяй, вызначэннем метадычных арыенціраў і выбарам педагагічных тэхналогій. Хутка адаптавацца ў калектыве мне дапамог і вопыт грамадскай работы ў БДПУ. Калі я там вучылася, была прафсаюзным лідарам факультэта, валанцёрам, вяла навуковую работу. Па натуры я камунікабельная, таварыская і добразычлівая. Працягваю сваю грамадскую дзейнасць і ў школе, курырую самыя розныя напрамкі. Уваходжу ў маладзёжны савет прафсаюза Маскоўскага раёна сталіцы.



### Выкладаць гуляючы

**— Прадмет "Гісторыя" — кансерватыўны, заснаваны на дакладным матэрыяле, гістарычных падзеях і асобах. Як зрабіць яго цікавым, захапляльным?**

— Мне пашчасціла ў жыцці. Першы і самы галоўны вопыт выкладання гісторыі я атрымала ад сваёй школьнай настаўніцы Кацярыны Мікалаеўны Бець. Яна віртуозна выкладала прадмет, умела выкарыстоўваць розныя методыкі, магла ператварыць урок у тэатральную дзею з гістарычнымі вобразамі. Я наведвала яе заняткі з вялікім жаданнем. У час вучобы пачала развіваць цікавасць да гісторыі, пашыраць свае веды. Удзельнічала ў алімпіядах, навукова-даследчых канферэнцыях, шматлікіх праектах па гісторыі нашага краю, збірала звесткі пра гістарычныя падзеі, фотаздымкі. Цяпер усё гэта — трывалы падмурак у маёй настаўніцкай практыцы. Мару, каб выхаванцы спяшаліся на мае ўрокі.

**— Што дапамагае зрабіць прадмет жывым?**

— Дапамагаюць нагляднасць, інтэрактыў, гульня і многія іншыя формы і метады выкладання. Усе яны даюць магчымасць дзецям дакрануцца да гісторыі самастойна. Гэта аснова асноў для развіцця іх мыслення, уменняў думаць, разважаць, аналізаваць, удумліва засвойваць і запамінаць вучэбны матэрыял. Я заўважыла, што вучня не трэба перабіваць падчас адказу на ўроку, навязваць сваё меркаванне, нават калі ён памыляецца. Яго трэба абавязкова выслухаць, пахваліць. Школьнік ацэніць, што з ім лічацца, ставіцца да яго паважліва, і стане больш актыўным, зацікаўленым вучобай. Свой прадмет імкнуся тлумачыць на мове вучняў, каб ім было цікава.

Напрыклад, разглядаем у 7 класе тэму "Эпоха Адраджэння". Перыяд XIV—XV стагоддзяў характарызуе наяўнасць значных гістарычных асоб. Па кожнай з іх шмат звестак, і дзецям цяжка іх запамінаць. Аблегчыць задачу я вырашыла праз стварэнне ў сацыяльных сетках старонкі пэўнай гістарычнай асобы — такі спосаб замацавання інфармацыі з'яўляецца для вучняў самым прымальным. Я дзялю клас на групы і прапаноўваю стварыць старонкі гістарычных асоб з выкарыстаннем падручніка, дапаможніка, раздатачнага матэрыялу, а на аснове сабраных даных — партрэт гістарычнай асобы. Так, у гульнявой сацыяльнай сетцы з'явіліся своеасаблівыя прафайлы. І, мяркуючы па выніках, тэму дзеці засвоілі добра. Відавочна, што лягчэй запамінаецца тое, што сам ствараеш.

Існуе шмат сучасных гульняў, якія падыходзяць для вывучэння сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі — іх я таксама выкарыстоўваю на ўроках. Гульнявы фармат дапамагае перадаваць веды даступнай мовай, на ўроку дзеці вельмі актыўныя, зацікаўленыя, імкнуцца да лідарства. У нашай школе я кірую клубам "Фенікс", які ўваходзіць у склад Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА. Нядаўна вучні і педагогі школы пабывалі на фестывалі па лініі ЮНЕСКА ў расійскім Уладзіміры, дзе дзяліліся вопытам і творчымі знаходкамі. У расійскіх калег я запазычыла інтэлектуальную гульню "Дэбаты", якую планую выкарыстоўваць на сваіх уроках. Пошук новых метадаў выкладання прадоўжу. Не толькі я вучу дзяцей, але і дзеці вучаць мяне сучасным трэндам і новым формам узаемадзеяння.

> *Я дакладна абазначыла межы паміж сабой і вучнямі, правілы паводзін, якія павінны выконвацца на ўроку: уважліва слухаць, выконваць усе заданні, сачыць за ходам заняткаў і не адцягваць увагу аднакласнікаў не па тэме ўрока.*

### Я ў класныя хачу!

**— Як ставіцеся да класнага кіраўніцтва? Не перашкаджае выкладанню?**

— Калі ўладкоўвалася на работу, адразу сказала кіраўніцтву: "Я ў класныя хачу". І ні разу не пашкадавала аб гэтым. Я выкладаю гісторыю і грамадазнаўства ў 5—11 класах, яшчэ і з'яўляюся класным кіраўніком у 5 "Б". Відавочна, нагрузка немалая, праца напружаная. Але не магу сказаць, што я вельмі стамляюся. Дзеці настолькі мяне падсілкоўваюць сваёй энергіяй, няўрымслівасцю, апантанасцю, што прыходжу дадому натхнёная, акрыленая, з жаданнем рабіць яшчэ больш. Выхаваўчая работа — гэта вялікая частка настаўніцкай працы. Яна неадрыўная ад вучэбнага працэсу, кожны ўрок нясе ў сабе выхаваўчы патэнцыял. Выкладанне — гэта не толькі веды, але і фарміраванне каштоўнасных, асноватворных якасцей, на якіх грунтуецца характар юнага грамадзяніна. У гісторыі кожная тэма прасякнута пачуццямі грамадзянскасці, патрыятызму, любові да Радзімы. Класнае кіраўніцтва — працяг выхаваўчай работы.

Акрамя класных гадзін, я занята з дзецьмі ў выхадныя дні. Мы праводзім розныя мерапрыемствы, арганізоўваем паходы ў тэатр і кіно, экскурсіі ў музеі і проста сустракаемся за кубачкам чаю. І калі прыходзіць амаль усе вучні, а некаторыя нават з бацькамі, значыць, ім гэта патрэбна і цікава. У мяне шмат напрацовак у выхаваўчай рабоце са школьнікамі. Яшчэ ў студэнцкія гады кожнае лета ездзіла ў дзіцячы аздараўленчы лагер, дзе была выхавальніцай, на 4 курсе універсітэта працавала ў сярэдняй школе № 77 сталіцы. Гэты вопыт служыць мне добрай падмогай у рабоце настаўніка і класнага кіраўніка. Мне хочацца ўкласці ў сваіх дзяцей максімум, каб пасля заканчэння школы яны з цеплынёй успаміналі свае школьныя гады і педагогаў.

> *Не толькі я вучу дзяцей, але і дзеці вучаць мяне сучасным трэндам і новым формам узаемадзеяння.*

**— На якіх прынцыпах будуеце адносіны з бацькамі?**

— Класнае кіраўніцтва — гэта найперш супрацоўніцтва з бацькамі, менавіта ў тандэме з імі выхаваўчая работа дае неабходны эфект. Калі я збірала бацькоў вучняў на свой першы бацькоўскі сход, было вельмі хвалююча, у галаве ўзнікала шмат пытанняў: ці змагу заваяваць у іх давер, як арганізаваць выхаваўчую работу, каб бацькі не заставаліся ўбаку? Але мне пашанцавала: мамы і таты адразу мяне падтрымалі. Цяпер мы на адной хвалі, разам шукаем падыходы ў выхаванні і імкнёмся іх рэалізоўваць.

Каб удасканаліць сваю работу, планую і далей развівацца. Я скончыла ўніверсітэт, магістратуру, а цяпер вывучаю псіхалогію, якая цесна звязана з педагогікай, каб знаходзіць новыя грані выкладання свайго прадмета, захапляць ім дзяцей і вучыць іх жыццю. Маю другую кваліфікацыйную катэгорыю, расту ў прафесіі. Дзеці мяне матывуюць і натхняюць, і хочацца верыць, што гэта ўзаемна.

**Ала КЛЮЙКО.**